Сяргей НОВІКАЎ

# Адлюстраванне падзей на Буйніцкім полі 12 ліпеня 1941 г. у нямецкіх архіўных матэрыялах



*НОВІКАЎ Сяргей Яўгенавіч — кандыдат гістарычных навук, дацэнт, загадчык кафедры гісторыі і беларусазнаўства МДЛУ. Нарадзіўся ў в. Радзіца Крупскага р-на Мінскай вобл., у 1980 г. скончыў МДПІ імя М. Горкага. Займаецца даследаваннем эканамічнай гісторыі Беларусі перыяду нацысцкай акупацыі, праблем германскай гістарыяграфіі гісторыі Другой сусветнай вайны. Аўтар манаграфіі "Эканамічная палітыка нацысцкай Германіі ў Беларусі 1941—1944 гг.: агляд крыніц і германскай гістарыяграфіі 1990-х гадоў" (Мн., 2002), "Беларусь у кантэксце германскай гістарыяграфіі гісторыі Другой сусветнай вайны" (Мн., 2004). Сааўтар вучэбных дапаможнікаў для школьнікаў і студэнтаў "Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)" (Мн., 2004), "Великая Отечественная война советского народа (в контексте Второй мировой войны)" (Мн., 2005), навуковых выданняў "Беларусь в годы Великой Отечественной войны 1941—1945" (Мн., 2005), "Беларусь у перыяд Вялікай Айчыннай вайны: погляд у святле новых крыніц" (Мн., 2005). З'яўляецца сарэдактарам навуковых зборнікаў "Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць". Вып. 1—5 (Мн., 2002—2007).*

Беларускія даследчыкі ўпершыню маюць магчымасць пазнаёміцца з дакументам, які ўтрымлівае шэраг важных звестак пра тое, як з нямецкага боку ацэньваўся ход падзей пад Магілёвам 12 ліпеня 1941 г., вядомых у айчыннай гістарыяграфіі як "бой на Буйніцкім полі"[1]. Гэта дазваляе вызначыць, наколькі поўна і аб'ектыўна згаданыя падзеі асвятляюцца ў айчынных і замежных дакументальных і гістарыяграфічных крыніцах. Прапанаваны дакумент носіць адметны характар, бо ён адлюстроўвае паўсядзённую гісторыю гераічных і трагічных падзей лета 1941 г. у Беларусі.

У дзённіку баявых дзеянняў 6-га нямецкага танкавага палка, 2-і батальён якога якраз і вёў 11—12 ліпеня 1941 г. бой на паўднёва-заходніх подыходах да горада на Дняпры, захаваліся рапарты камандзіраў 5-й, 7-й і 8-й танкавых рот. Гэтыя падраздзяленні з'яўляліся непасрэднымі выканаўцамі загада камандзіра 3-й танкавай дывізіі генерал-лейтэнанта В. Модэля, якая ў складзе 2-й танкавай арміі (танкавай групы) генерал-палкоўніка Г. Гудэрыяна павінна была забяспечыць "прарыў праз умацаванні на Дняпры і пачаць наступленне на Смаленск"[2]. Раніцай 12 ліпеня 1941 г. ад камандзіра дывізіі В. Модэля паступіла кароткае паведамленне: "Становішча на 6.00. 3-я танкавая дывізія наступае на ворага на захад ад Дняпра, на паўднёвы захад ад Магілёва"[3]. Палявы штаб генерал-палкоўніка Г. Гудэрыяна ў гэты час знаходзіўся ў Талачыне. У вячэрнім запісе штабнога аддзела ад 12 ліпеня адзначалася: "Дзённае паведамленне, 12.7.41, 23.40. 3-й танкавай дывізіі выйсці з раёна Буйнічы для правядзення пераправы цераз Днепр злева ад 10-й пяхотнай дывізіі (паміж Магілёвам і Старым Быхавам. — **Аўт.**), каб весці наступленне ў раёне Магілёў—Чавусы—Роснаў"[4].

Камандаванне 6-га танкавага палка, выконваючы загад камандзіра дывізіі, вяло актыўную разведку, здабывала звесткі пра ландшафт мясцовасці, размяшчэнне на ёй абарончых умацаванняў, пра наяўнасць жывой сілы і баявыя пазіцыі савецкіх часцей. А 20-й гадзіне 11 ліпеня 1941 г. разведка дакладвала, што на захадзе, поўначы і поўдні ад горада выяўлены процітанкавыя равы, мінныя палі і ўмацаваныя пазіцыі процітанкавай артылерыі[5]. Атрыманыя разведданыя былі перададзены камандзірам трох рот, якія раніцай 12 ліпеня пачыналі наступленне на напрамку галоўнага ўдару 2-га батальёна. Уздоўж шашы Быхаў—Магілёў з арыенцірам на в. Буйнічы павінна весці наступленне 7-я рота, паміж Бабруйскай шашой і чыгункай на Гомель — 8-я, паміж чыгункамі на Гомель і Асіповічы з арыенцірам на в. Туманаўка — 5-я рота.

У рапартах камандзіраў танкавых рот ёсць звесткі пра іх колькасны склад і баявыя дзеянні 12 ліпеня, праведзеныя ў ходзе выканання пастаўленых задач[6]. Звесткі пра разгортванне баявых дзе-

яннявў на асобных участках пауднёва-заходняга плацдарма пад Магілевам (5 км. — **Аут.**) адлюстроўваюць ступень баявой гатоўнасці абаронцаў горада, найперш часцей Чырвонай Арміі, якія праявілі свае тактычнае уменне і практычныя навыкі баявых дзеянняў у час арганізацыі абароны на Дняпры. Паводле сведчанняў гэтай дакументальнай крыніцы, на лініі наступлення непасрэдна ў раёне в. Буйнічы германскія войскі сустрэлі эфектыўна дзеючую агнявую абарону савецкіх артылерыстаў, танкістаў і пяхоты, а таксама мінныя палі.

Як вынікае з нямецкага дакумента, бой на участку мясцовасці пад в. Буйнічы, дзе вяла наступленне 7-я танкавая рота, меў свае значныя адметнасці[7].

З дакумента відаць, што ў ходзе наступлення нямецкіх танкавых рот самым складаным з'яўляўся участак баявых дзеянняў не пад в. Буйнічы, якая размешчана на адкрытай мясцовасці, а ў раёне лясной в. Туманаўка. Калі 8-я танкавая рота, якая дзейнічала ў цэнтры наступаючых падраздзяленняў, у асноўным выканала задачу і заняла участак паміж Бабруйскай шашой і чыгункай на Гомель, пры гэтым узяла ў палон 80 чырвонаармейцаў, то на лініі наступлення 5-й танкавай роты пад Туманаўкай савецкія артылерысты, баявыя разлікі танкаў і процітанкавых гармат, а таксама сапёры, якія ўмела паставілі міннае поле, падарвалі і знішчылі ўсе баявыя машыны 2-га і 4-га ўзводаў роты[8].

Навуковы аналіз дакумента дае магчымасць выявіць новыя, хоць і супярэчлівыя, звесткі пра рэальныя баявыя падзеі 12 ліпеня 1941 г., якія да гэтага часу ўсебакова не адлюстраваны нават у спецыяльных даследаваннях. Паводле гісторыка-дакументальных хронік Магілёва, гарадоў і раёнаў Магілёўскай вобласці і новых прац пра абарону на Дняпры[9], "гарачы" ліпеньскі дзень 1941 г. застаецца ў рамках канцэпцыі, прапанаванай першым летапісцам гісторыі гераічнай абароны дняпроўскага рубяжа на Буйніцкім полі — ваенным карэспандэнтам К.М.Сіманавым.

Аналізуемы дакумент дапаўняе традыцыйнае апісанне бою на Буйніцкім полі і дае магчымасць, "зыходзячы з канкрэтнай абстаноўкі таго часу, з рэальна існуючай сітуацыі", даведацца пра сапраўдныя падзеі, удакладніць маштабы баявых дзеянняў, і самае істотнае, убачыць іх у колькасным вымярэнні. Інакш кажучы, гэты дакумент дапамагае знайсці больш канкрэтныя адказы на шэраг пытанняў і перш за ўсе, як піша старанны магілёўскі краязнавец М.С.Барысенка, сказаць суровую праўду пра трагічнае лета 1941 г. на дняпроўскім рубяжы[10].

Дакумент дапамагае чытачу ўбачыць падзеі з боку нямецкага камандавання, ацэнку нямецкімі афіцэрамі гераічнай абароны гэтага плацдарма сіламі 388-га стралковага палка, 340-га лёгкага артылерыйскага палка і магілёўскімі апалчэнцамі. Можна не пагаджацца з некаторымі высновамі і ацэнкамі, якія ёсць у рапартах, аднак нельга адмаўляць факты рэальных падзей. Патрабуецца ўзважаны крытычны аналіз і грунтоўная іх апрацоўка спецыялістамі. Аўтар у гэтым артыкуле не ставіць перад сабой такой задачы. Наша мэта ўвесці ў навуковы ўжытак невядомы беларускім даследчыкам архіўны дакумент. Гэта дасць магчымасць паглядзець на сітуацыю вачамі праціўніка, што карысна для аб'ектыўнага аналізу падзей ваеннай гісторыі Беларусі. Аналіз дакумента ставіць чытача перад няпростым выбарам: або адысці ад аднабаковага погляду і, такім чынам, пазбегнуць суб'ектыўных ацэнак, або пайсці па шляху набліжэння да рэальнай карціны на аснове існуючых гістарычных і гістарыяграфічных крыніц.

Зазначым, што нямецкі дакумент не замоўчвае тое, што чырвонай ніткай праходзіць праз даследаванні беларускіх навукоўцаў пра баявыя дзеянні пад Магілёвам 12 ліпеня 1941 г. Неабходна адзначыць і такую важную акалічнасць: на сваім шляху часці германскага вермахта фактычна ўпершыню з пачатку вайны з СССР сустрэлі моцны рубеж супраціўлення, на якім мужна стаялі савецкія воіны, выконваючы загад вышэйшага камандавання аб ператварэнні Магілёва ў "непрыступную крэпасць".

Дакумент, выяўлены аўтарам у фондзе Федэральнага ваеннага архіва Германіі ў Фрайбургу (зямля Бадэн-Вюртэмберг. — **Аўт.**), складаецца з 5 розных матэрыялаў, частка з якіх не мае дачынення да падзей 12 ліпеня 1941 г., таму яны намі не прыводзяцца, што пазначана шматкроп'ямі. Дакумент уключае рапарты трох рот, аддзялення батальённай разведкі і іх высновы, а таксама спіс пра колькасны склад штабных і баявых падраздзяленняў. Пераклад зместу рапартаў і спіса зроблены аўтарам без купюр. Выключэннем з'яўляюцца службовыя звесткі ў пачатку дакумента. У дачыненні да асобных фактаў і спецыфічнай лексікі дакумента аўтар палічыў патрэбным унесці свае ўдакладненні, узятыя ў дужкі, якія не скажаюць сэнс, а робяць тэкст больш зразумелым для чытача. Рымскія абазначэнні, праз якія ў дакуменце зафіксаваны нумары германскіх вайсковых падраздзяленняў, перадаюцца арабскімі лічбамі.

**Федэральны ваенны архіў Германіі (далей — BA-MA) RH 27-3/29: Panzer-Regiment 6. Erfahrungsbericht: Kampf der II./Pr.Rg.6 bei Mogilew am 12.7.1941, Bl. 40—46.**

*Арыгінал (пераклад аўтара). Друкуецца ўпершыню.*

6-ы танкавы полк[11] Палявы штаб, Гарбатка, 20.7.41

I a

[illegible]*

[Камандаванню]

3-й танкавай дывізіі**

[illegible]***

---

* Службовыя спасылкі, у адпаведнасці з якімі падрыхтаваны дакумент.

** У пачатку вайны ў склад 3-й танкавай дывізіі ўваходзілі тры палкі: 6-ы і 3-і грэнадзёрскі танкавыя і 394-ы пяхотны.

*** Прыведзены рапарты 1-га і 2-га батальёнаў пра баявыя дзеянні пад Студзёнкай—Валковічамі і Чавусамі, а таксама рапарт пра тэхнічнае становішча і арганізацыю бягучага рамонту.

**І. Бой 2-га батальёна***
**6-га танкавага палка пад Магілёвам.**

*1. Рапарт 7-й роты** пра баявыя дзеянні пад Магілевам 12 ліпеня 1941 г.*

Спачатку рота з удзелам мотапяхоты і пры падтрымцы артылерыі шырокім клінам прасунулася у паўночна ўсходнім напрамку. Чыгунка [Магілёў—Гомель. — **Аут.**] была дасягнута і пераадолена у пункце 12 без сутыкнення з ворагам. Рота прайшла лес і спынілася на свабодным месцы на поўдзень ад [ракі] Ераукі.

З улікам таго, што левая наступаючая група для прасоўвання наперад павінна была выкарыстоўваць [Бабруйскую — **Аут.**] шашу, 1-ы узвод быў накіраваны на пошук праходу праз нізінны участак, таму што пяхота не выканала просьбу аб разведцы. У ходзе цяжкага пераадолення броду адзін танк застаўся ў рацэ з пашкоджаннямі вядучага кола. На вышыні на ўсход ад Ераукі рота замацавалася ў суправаджэнні роты тэхнічнага забеспячэння і праз 4-ы узвод наладзіла сувязь з пяхотай, якая падыходзіла да Сяльца.

Рота разам з пехацінцамі, што рухаліся перабежкамі, пачала прасоўвацца далей на паўднёвы край [в.] Буйнічаў.

Да гэтага часу рота не мела сутычак з ворагам. Многія пазіцыі ў лесе і вакол вёскі былі незанятыя. Паводле звестак ваеннапалонных, тры рускія батальёны адступілі ўначы на ўчастку роты. У час замацавання 1-га узвода на пазіцыях на ўсход ад Ераукі была адбіта атака рускай пяхоты.

Пры набліжэнні да Буйнічаў былі відаць рускія, якія адыходзілі і з-за пагрозы сваёй пяхоце не маглі весці бой. На занятай мясцовасці засталіся разбураныя акопы і хады зносін. У час бою, які пачаўся пры ўзаемадзеянні з 2-м узводам 3-га пяхотнага палка, на правым флангу з'явілася [савецкая. — **Аут.**] процітанкавая гармата, ліквідаваная адразу ж 1-м узводам. З пачаткам моцнага абстрэлу процітанкавымі гарматамі 3-і узвод цалкам спешвае ца, на заходнім канцы Буйнічаў знішчае дзве процітанкавыя гарматы [...] хоць дзве іншыя працягваюць весці агонь, змяняючы свае пазіцыі. Абстрэл процітанкавымі гарматамі пры гэтым не спыняецца. Таму для ўзмацнення абароны левага фланга побач з 3-м узводам уводзіцца 4-ы ўзвод. Гэта падраздзяленне здолела знішчыць злева ад дарогі дзве процітанкавыя гарматы і танк Т-26 [лёгкі танк з экіпажам 3 чалавекі, меў на ўзбраенні 45 мм гармату і 7,62 мм кулямёт, лабавая браня — 16 мм, выкарыстоўваўся ў пачатку вайны. — **Аут.**]. У гэты момант на правым флангу адзін за адным з'явіліся чатыры танкі Т-26 і Т-37 [лёгкі танк вагой каля 14,65 т, выкарыстоўваўся ў пачатку вайны. — **Аут.**], знішчаныя 1-м узводам.

На працягу ўсяго бою рота была пад агнем не толькі процітанкавых гармат і танкаў ворага, але і прыцэльнага агню артылерыі, добра бачнай на вышыні і з узлеску на поўнач і паўночны ўсход ад Буйнічаў.

Рота тэхнічнага забеспячэння, якая пакуль што не была задзейнічана, знаходзілася пад прыкрыццем танкаў і асобных умацаванняў. З гэтага моманту яна з некалькімі танкамі выкарыстоўваецца для прачэсвання тэрыторыі злева ад шашы. З умацаваных пазіцый і бліндажоў пры дапамозе ручных гранат было захоплена каля сотні палонных.

Толькі што ўведзены 2-і узвод 3-га пяхотнага палка атрымлівае загад наступаць разам з танкамі. У гэты ж час роце загадана засяродзіцца ў раёне галоўнай шашы на захад ад чыгуначнага пераходу. Да канчатковага высвятлення, які загад патрэбна выконваць, рота атакуе ў напрамку чыгункі з адлегласці ў 1 200 м. Тут на паўночны захад ад Буйнічаў з'явілася пяхота, якая з цягачамі, артылерыяй і танкамі займала падрыхтаваныя пазіцыі ў раёне размешчаных процітанкавых равоў.

Пасля таго як пяхота заняла абарону, рота была гатова выконваць загад аб ліквідацыі ворага. У гэты момант танк Т-III трапляе на міну, у выніку чаго былі паранены вадзіцель і радыст. Паколькі пашкоджанні атрымаў корпус, каробка перадач і хадавая частка, можна было лічыць танк цалкам страчаным. Другі танк Т-III быў ужо выведзены са строю ў выніку пападання [савецкага снарада. — **Аут.**]. Ён споўз у абарончую траншэю. Абодва камандзіры танкаў рабілі намаганні эвакуіраваць свае машыны, але былі паранены снайперскімі стрэламі [...]

Заўвагі. Міны хутчэй за ўсё ставяцца так, каб 4 ці 5 мін ляжалі на мінным полі хаатычна і на рознай адлегласці паміж сабой. У час наступлення рота павінна перайсці гэтае поле і не патрапіць на міны.

У сувязі з гэтым [камандаванне. — **Аут.**] палка робіць такую выснову:

Выхад роты разам з пяхотай у бліжэйшы лес і знаходжанне на адкрытай мясцовасці на поўдзень ад Ераукі адпавядалі мэце, паколькі разведка нізіннага ўчастка па абодва берагі ракі павінна была абавязкова праводзіцца пяхотай і сапёрамі, што не было выканана па невядомых у палку прычынах. Таксама і далейшыя дзеянні роты ў ходзе прасоўван-

---

*Паводле даведніка Г.Тэсіна, летам 1941 г. 6-ы танкавы полк складаўся з 1-га і 2-га танкавых батальёнаў. У склад іх першапачаткова ўваходзілі па 3 роты, дзве з іх былі укамплектаваны лёгкімі танкамі T-II і сярэднімі танкамі T-III і T-IV. Фактычна агульная колькасць танкаў у двух батальёнах у ходзе летніх баёў 1941 г. складала 208 адзінак, уключаючы і танк камандзіра палка. За першыя чатыры тыдні баёў, тры з якіх прыпадалі на тэрыторыю Беларусі, былі страчаны 54 танкі, большая частка з іх — пад Магілевам.

** Летам 1941 г. па штатнаму раскладу на ўзбраенні нямецкай танкавай роты знаходзіліся тры віды танкаў: лёгкі T-II (экіпаж 3 чалавекі, 20 мм гармата, 7,92 мм кулямёт), сярэдні T-III (экіпаж 5 чалавек, 37 мм гармата, два 7,92 мм кулямёты) і T-IV (экіпаж 5 чалавек, 75 мм гармата, два 7,92 мм кулямёты). Як бачна са спіса (гл. дакумент), "лёгкая" рота мела на ўзбраенні 5 танкаў T-II і 17 танкаў T-III (усяго 22 танкі), "сярэдняя" (без аднаго ўзвода) — 5 танкаў T-II і 10 танкаў T-IV (усяго 15 танкаў).




*Фрагмент савецкай карты, якой карысталіся нямецкія афіцэры падчас штурму Магілева*

*BA-MA. RH 24–7/48. Bl. 37–38*

ня наперад пяхоты перабежкамі з'яуляліся абгрунтаванымі. Аднак пасля першых перагавораў з батальенным камандаваннем прапала сувязь з камандзірам правай ударнай групы, у той час як камандзір танкавай роты падтрымліваў пастаянную сувязь толькі з камандзірам роты, што дзейнічала на напрамку галоўнага удару. Гэтак жа і далейшыя дзеянні роты з'яўляліся апраўданымі, пасля таго як яна атрымала ад камандавання 2-га батальёна загад ліквідаваць ворага і быць гатовай для наступлення на заходнім флангу (так у дакуменце. — **Аут.**). У час адыходу падрыў танка на міне быў выпадковасцю, не звязанай з мінным полем, а з мінамі, якія былі размешчаны на полі хаатычна і без дакладнай адлегласці паміж сабой. Між тым перад гэтым рота пераадолела поле без страт.

*2. __Рапарт 5-й роты__ пра __баявыя дзеянні пад Магілевам__ __12 ліпеня__ 1941 г.*

1-ы і 4-ы узводы адзін каля аднаго разам з мотапяхотай наступалі на Гуслянку. 3-і узвод сумесна з узводам мотапяхоты быў выкарыстаны на левым флангу для разведкі мясцовасці у раёне [вёсак] Чэлнаукі, Тачкі і Туманаукі, у той час як 2-і узвод заставауся у якасці рэзерву для камандзіра роты капітана Папэ, які падыходзіў злева ад шашы [Магілеў—Бабруйск. — **Аут.**] і пазней злева ад чыгункі Стары Быхаў—Магілеў. Асаблівую перашкоду стваралі лес і балота, што знаходзіліся на мясцовасці для наступлення з захаду на усход.

На вышынях на паўночны усход ад Туманаукі перадавыя групы роты былі сустрэты моцным агнём артылерыі і танкаў. Пасля зацяжной перастрэлкі, якую вялі узводы, камандзір роты прасунууся да пярэдняга рубяжа наступлення і спыніў роту каля вышыні. Потым вярнууся назад для таго, каб падцягнуць наперад мотапяхоту. Між тым 1-ы узвод заўважыў артылерыйскія умацаванні і выступіў пад прыкрыццем чыгуначнага насыпу наперад для іх знішчэння. Каля 800 м на поўнач ад вышыні побач з чыгункай 1-ы узвод трапіў на міны. У гэты час да вышыні вярнууся камандзір роты разам з мотапяхотай. Але вышыню вымушаны былі пакінуць з-за моцнага артылерыйскага агню. Танкі і пяхота замацаваліся побач з вышыней злева ад чыгункі. Камандзір роты аддаў загад 4-му узводу пайсці у абход далей на захад, каб з дапамогай тэхнічнага узвода знайсці праход у процітанкавых равах. 2-і узвод быў пазней пасланы для падмацавання.

2-і і 4-ы узводы выступілі у напрамку [в.] Галынец без уліку таго, што там можа знаходзіцца тэхнічны узвод. Між тым камандзір роты з 3-м узводам прасунууся на поўнач у напрамку разведаных савецкіх палявых умацаванняў, каб прарваць лінію акружэння, вывесці з яго 1-ы узвод і заняць суседнюю вышыню, якая знаходзілася амаль што за 1 000 м далей на поўнач па лініі наступлення. Два танкі 3-га узвода прарвалі драцяную загароду і уварваліся на лінію агню. Пры гэтым выявілася, што замест процітанкавых равоў тут былі траншэі.

У час авалодання палявымі умацаваннямі два танкі 3-га узвода трапілі пад моцны агонь, які з невялікай адлегласці злева, справа вёўся з васьмі бачных процітанкавых умацаванняў. Танкі загарэліся. Камандзір роты прыкрыў агнём свайго танка адступленне рэштак 3-га узвода цераз варожыя акопы і драцяную загароду. Атакуючыя [нямецкая пяхота. — **Аут.**] дасягнулі танка камандзіра і выкарысталі яго для свайго прыкрыцця. У час адыходу камандзірскі танк быў выведзены са строю трапным пападаннем у вежу, у выніку чаго была пашкоджана гармата, а сам камандзір смяротна паранены.

2-і і 4-ы узводы не адказвалі на радыёзапыты, таму што усе танкі абодвух узводаў былі выведзены са строю агнем артылерыі і процітанкавых гармат. Частка танкістаў вярнулася назад праз Галынец пад прыкрыццем дымавой заслоны. Рэшткі роты з'явіліся на чыгуначным пераездзе пад камандаваннем лейтэнанта Хінцпетэра.

У дачыненні да гэтага [камандаванне] палка мае такую выснову:

Увод 3-га узвода з аддзяленнем мотапяхоты для разведкі мясцовасці на левым флангу з'явіўся распыленнем сіл роты. Яна, нягледзячы на пастаўленую перад ёй задачу аб узаемадзеянні з батальёнам, які павінен быў забяспечыць разведку праз спецыяльную разведвальную службу, вымушана была сама весці разведку. Магчыма, роце можна было адной наступаць у напрамку вышынь пасля таго, як яна пераадолее лес і балота на усход ад [в.] Тачкі. Разумеючы, што пяхота павінна была рухацца за танкамі, камандзір роты паспрабаваў асабіста выслаць мотапяхоту наперад. Дзеянні 1-га узвода па самастойнай ліквідацыі [савецкіх — **Аут.**] артылерыйскіх пазіцый, што на справе выявілася як распыленне сіл, былі зразумелыя. Узвод здолеў пад прыкрыццем прасунуцца наперад, таму яго камандзір меркаваў, што такім чынам адцягвае на сябе моцны артылерыйскі абстрэл. Задача 4-му узводу — павярнуць на захад — была таксама у некаторай ступені апраўданая, паколькі адкрытую мясцовасць, якая знаходзілася перад мотапяхотай, пасляхова мінулі і патрапілі там на патрэбны для танкістаў тэхнічны узвод. На яго пошукі быў пасланы спачатку 2-і, потым для падмацавання 4-ы узводы. Яны прасунуліся даволі далёка наперад і трапілі пад знішчальны агонь артылерыі і танкаў. У выніку усе іх танкі выйшлі са строю. Спроба камандзіра роты, ужо з апошнім узводам, які знаходзіўся у яго распараджэнні, узмацніць узвод, які пры падаўленні артылерыйскага агню натыкнууся на мінное поле, і наступаць далей, каб спераду пазбегнуць агню цяжкай артылерыі, магла б прывесці да поспеху у выпадку дастаткова моцнай агнявой падтрымкі сваёй артылерыяй і захавання усей роты. Да няўдачы прывяло тое, што зноў з'явіліся танкі, але адсутнічала наша мотапяхота.

*3. Рапарт 8-й роты пра баявыя дзеянні пад Магілёвам 12 ліпеня 1941 г.*

8-я рота спачатку заставалася ў рэзерве на танкавай дарозе ў тыле камандавання 2-га батальёна. Уходзе наступлення батальён Вельмана, якому падпарадкоўвалася 7-я рота, забраў танк, што прывяло да страты сувязі з 7-й ротай. 8-я рота наступала справа ад дарогі на Магілёў, каб аднавіць сувязь з батальёнам Вельмана. У Буйнічах рота наносіла удар па перадавой [савецкай. — **Аўт.**] пяхотнай роце з выкарыстаннем процітанкавай гарматы. Паколькі перад ротай пяхоты знаходзілася 7-я рота, 8-я рота адышла назад, каб падтрымаць злева ад танкавай дарогі 5-ю роту. У час адыходу здавалася, што батальён Вельмана як быццам не мае сувязі паміж асобнымі ротамі. Пасля прыбыцця ў Сялец — месца размяшчэння батальёна — рота атрымала загад весці наступленне злева ад танкавай дарогі і наладзіць кантакт з 5-й ротай. Рота наступала клінам паміж чыгункай на Гомель і дарогай. Ужо праз некалькі соцень метраў пачаўся абстрэл з боку праціўніка, пазіцыі якога спачатку не былі выяўлены. Рота працягвала наступленне. Мэтай яго была цагельня на захад ад Магілёва і вышыні з лесам. Цагельня і вышыні былі ўзяты пры агнявой падтрымцы, паколькі варожы агонь быў спачатку слабы. На жаль, танк лейтэнанта Нінабера атрымаў пападанне ў камандзірскую вежу, зараджальшчык быў паранены, а вежу заклініла. Між тым па сувязі рота чула рашучыя просьбы пра дапамогу ад 5-й роты і атрымала загад ад камандавання 2-га батальёна аказаць ей дапамогу. Рота адразу ж павярнула да чыгуначнага насыпу. Прама на насыпе танк камандзіра роты лейтэнанта Кёлера наехаў на міну, якая прабіла корпус, пашкодзіла гусеніцу і цяжка параніла обер-яфрэйтара Бюхлера. Выкліканы для эвакуацыі падбітага танка T-II таксама наехаў на міну, якая пашкодзіла гусеніцу. У той час як лейтэнант Кёлер высунуўся з башні, каб з дапамогай іншага танка паведаміць пра страту і даручыць камандаванне ротай лейтэнанту Якабсу, увесь экіпаж танка-800 [нумарацыя танка. — **Аўт.**] пры эвакуацыі атрымаў кулямётныя раненні. Рота ўтварыла выступ да цагельні, чыгуначнага насыпу і абарончага рубяжа горада. Перад горадам знаходзіўся пояс моцных палявых умацаванняў, якія ўтрымлівалі савецкія войскі. Рота атакавала іх і дзякуючы свайму моцнаму агню прымусіла адступіць. Асобныя танкі наступалі да самага процітанкавага рова з умацаваннямі, у якіх сядзелі рускія. Варожы агонь спыніўся. Калі рота заняла мясцовасць, былі знішчаны два [савецкія. — **Аўт.**] танкі і дзве процітанкавыя гарматы.

5-я рота магла дапамагчы роце настолькі, наколькі гэта было магчыма для роты, якая залягла з-за пастаяннага франтальнага агню ворага. Дапамагчы эвакуіраваць параненых было немагчыма, таму што вышыня чыгуначнага насыпу не давала магчымасці яго пераехаць.

Неўзабаве рота атрымала ад камандавання 2-га батальёна загад па радыё на адыход разам з паранеными. Тры машыны эвакуіравалі спачатку многіх параненых пехацінцаў. Потым рота адышла. Хоць вярталіся па знаёмаму следу, на міну наехаў танк T-IV, на які быў перасаджаны лейтэнант Кёлер. Была пашкоджана хадавая частка. Другі танк таксама вярнуўся па вядомай дарозе і наехаў на міну так, што не мог больш рухацца. Пад варожым кулямётным і артылерыйскім агнем рота спрабавала на працягу больш за гадзіну адбуксіраваць абодва танкі, што, аднак, пад агнём варожай артылерыі зрабіць не удалося. У той час калі танкі обер-фельдфебеля Вакера і фельдфебеля Зайферта, якія наехалі на міны, да прыбыцця цягачоў павінны былі ахоўвацца, рота адступіла, захапіўшы амаль што 80 палонных. Машыны, якія былі вызначаны для аховы, паведамлялі, што рускія зноў хочуць заняць ужо пакінутыя палявыя умацаванні. Спачатку такі намер быў спынены агнем. Між тым варожы артылерыйскі агонь пачаў мацнець, таму машыны аховы вымушаны былі адысці на край в Сялец, перш чым стала магчымай эвакуацыя пашкоджаных танкаў пры дапамозе артылерыйскіх цягачоў. У канцы дня да камандавання 2-га батальена прыбыла ротная тэхніка.

У дачыненні да гэтага [камандаванне] палка мае такую выснову:

Спроба батальена сіламі 8-й роты аказаць дапамогу 5-й роце была немагчымай з-за непераадолення чыгуначнага насыпу [чыгунка Магілёў—Гомель. — **Аўт.**] хоць у якім небудзь месцы. Больш да рапарта няма чаго дадаць.

*4. Рапарт 1-га [штабнога] узвода 2-га батальёна пра баявыя дзеянні пад Магілёвам 12 ліпеня 1941 г.*

Узвод быў прызначаны спачатку ў рэзерв, але потым па загаду камандавання палка выкарыстоўваўся для разведкі. Задача — весці разведку на мясцовасці, за станам дарог і знаходжаннем ворага ваколіцы весцы Галынец.

1-ы узвод меў наступную задачу: назіранне за чыгуначным мостам за 10 км на паўднёвы захад ад Магілева, за тэрыторыяй у напрамку Туманаўкі, адтуль за лясной 4-кіламетровай дарогай на Галынец, далей за дарогай Каўлаўка[верагодна, Карэлаўка. — **Аўт.**] — Магілёў.

Прасоўванне было значна абцяжарана моцным загараджальным артылерыйскім агнём ворага, пад які ўзвод трапіў прыблізна за 500 м на паўночны захад ад чыгуначнага моста. Пасля гэтага рух праходзіў лягчэй аж да самай Туманаўкі. На гэтым участку 1-ы узвод быў абстраляны артылерыяй толькі адзін раз. У лесе ад Туманаўкі да Галынца павінны былі б знаходзіцца розныя дазорныя групы для правільнай разведкі шляхоў далейшага прасоўвання. Але і тут узвод патрапіў пад інтэнсіўны артылерыйскі абстрэл. Пасля паўторнай, больш дакладнай арыентацыі разведвальнае падраздзяленне здолела знайсці правільную дарогу. Пад аховай двух цяжкіх тан-

каў падраздзяленне прайшло спачатку да чыгуначнага насыпу, затым разам з камандзірскім танкам назад у Галынец. Веска не была занята ворагам, і праз яе быў дасягнуты паўночны край лесу. Адсюль былі выстаўлены пасты да [в.] Казелаўкі [верагодна, Карэлаўкі. — **Аўт.**] і на Магілеў. Пасты выявілі варожыя танкі, танкавыя ўкрыцці і кулямётныя пазіцыі [...]. У час перастрэлкі з танкамі і процітанкавай артылерыяй было выяўлена месцараспалажэнне нашых танкаў, што адразу правяло да моцнага абстрэлу нашага ўзвода і краю лесу. Узвод вымушаны быў перанесці пазіцыю на паўднёва-усходнюю частку [в.] Галынец. Тут планамерна ладзілася ахова. Калі лёгкі танк стаў на ахову, 5-я рота павінна была вярнуцца назад і спыніцца на адлегласці 500—1 000 м на паўднёвы ўсход ад вескі. Лёгкі ўзвод захаваў сваю пазіцыю. Ён павінен добра бачыць варожую мясцовасць і назіраць за перамяшчэннем на пазіцыях процітанкавых гармат і кулямётаў. Пасля 2 гадзіннай аховы 1-ы ўзвод вырашыў абстраляць з двух цяжкіх танкаў і танка T-II выяўленыя агнявыя кропкі процітанкавых гармат і кулямётаў. Пасля гэтага ўзвод адступіў назад да 2-га батальена. Калі ўзвод пакідаў Галынец, ён быў зноў прыцэльна абстраляны [...].

Нягледзячы на моцны артылерыйскі агонь, узвод адышоў назад да батальёна без адзінай страты.

У дачыненні да гэтага [камандаванне] палка мае такую выснову:

Дзеянні і паводзіны легкага ўзвода разведкі і аховы заходняга флангу адпавядалі мэтам.

<u>Вопыт, атрыманы 2-м батальенам у баявых дзеяннях пад Магілёвам</u>

1. Увядзенне ў бой асобнага танкавага батальёна супраць франтальна пабудаваных і моцна звязаных пазіцый (процітанкавыя равы і мінныя палі) з'яўляецца не вельмі выніковым.

2. У выпадку неабходнасці ўвядзення ў бой асобных рот перадавым батальёнам было б лепш уводзіць роты розных батальёнаў для таго, каб на ўсякі выпадак роты маглі папаўняцца і узмацняцца за кошт сваіх рэзервовых падраздзяленняў. Пры шырыні лініі фронту 2-га батальёна падыходзячыя сілы, асабліва медыцынскага і тэхнічнага персаналу, былі разрознены. Гэта вельмі моцна уплывала пры наступленні пад Магілёвам, паколькі чыгуначны насып з'яўляўся непераадольнай перашкодай для аказання якой-небудзь дапамогі заходняй наступаючай групе.

3. Узаемадзеянне танкаў і пяхоты на практыцы аказваецца асабліва складаным, паколькі надзейная падтрымка батальённага камандавання магчыма з выкарыстаннем сродкаў адной роты. У выніку гэтага роты, на жаль, узаемадзейнічалі толькі з камандзірам галаўной роты для таго, каб здолець на справе весці бой. З улікам прапановы (да пункта 2) камандзір роты і сам можа падтрымліваць сувязь з камандзірам батальёна і артылерыі.

4. Пры раптоўных атаках цеснае ўзаемадзеянне паміж танкамі і пяхотай на адкрытай мясцовасці магчыма толькі пры моцнай артылерыйскай падтрымцы, інакш чаканне танкамі падыходу пяхоты для атакі прамежкавых цэлей вядзе да страт у выніку агню варожай артылерыі і процітанкавых гармат.

5. Месцазнаходжанне танкавых равоў павінна вызначацца вельмі канкрэтна здымкамі з самалёта, каб танкісты маглі гэтыя равы пазначыць дакладна на сваіх картах, быць у стане своечасова заняць укрыцце перад ровам і адтуль падтрымліваць неабходным агнём пяхоту і сапераў для пераадолення імі танкавых равоў.

6. Першы наезд на міны наступаючыя не заўсёды разумелі як прычыну [наяўнасці міннага поля. — **Аўт.**], а ў большай ступені ацэньвалі гэта як пападанні процітанкавых гармат ці артылерыі. Гэтым тлумачыцца наезд многіх танкаў 5-й і 8-й рот на міны [...]*

<u>*V. Спіс колькаснага складу штабной роты, "лёгкай" танкавай роты з улікам падзелу на баявую і тэхнічную часткі***</u>

А. <u>Штабная рота танкавага батальёна</u>

<u>Агульная колькасць:</u> (5 [афіцэраў] — 35 [малодшых камандзіраў] — 142 [радавых]) = 182 чалавекі

1. Баявыя падраздзяленні:

| | |
|---|---|
| а) "лёгкі" танкавы ўзвод | 15 чалавек |
| б) узвод разведкі | 29 — " — |
| в) сапёрны ўзвод | 31 — " — |
| | 75 чалавек |

2. Іншыя:

| | |
|---|---|
| а) ротная група | 6 чалавек |
| б) узвод сувязі | 23 — " — |
| в) зенітны ўзвод | 13 — " — |
| г) зменны персанал | 10 — " — |
| д) група механікаў | 9 — " — |
| е) санітарная група | 12 — " — |
| ж) баявы абоз | 25 — " — |
| і) абоз забеспячэння | 9 — " — |
| | 107 чалавек |

Б. <u>"Легкая" танкавая рота</u>

<u>Агульная колькасць:</u>
(5 — 64 — 113) = 182 чалавекі
Па танках:
5 танкаў T-II (экіпаж 3 чалавекі) = 15 чалавек
17 танкаў T-III б (экіпаж 5 чалавек) = 85 — " —
100 чалавек

* Апушчаны пункты 2, 3 і 4 (тлумачэнне да спасылкі *** на с. 13).

** Трэба мець на ўвазе, што прыведзены штатны ўлік асабовага складу нямецкіх рот зроблены па стану на 20 ліпеня 1941 г., г. зн. роўна праз тыдзень пасля "боюна Буйніцкім полі" пад Магілёвам і амаль што праз месяц пасля пачатку ваеннай агрэсіі супраць СССР.

| | |
|---|---|
| зменны персанал | 25 чалавек |
| пасыльныя і вадзіцелі | 4 — " — |
| група механікаў | 23 — " — |
| баявы абоз | 26 — " — |
| абоз забеспячэння | 4 — " — |
| | 82 чалавекі |

В. "Сярэдняя" танкавая рота (без 3-га ўзвода)

Агульная колькасць: (6 — 42 — 96) = 144 чалавекі

Па танках:

| | |
|---|---|
| 5 танкаў T-II (экіпаж 3 чалавекі) | = 15 чалавек |
| 10 танкаў T-IV (экіпаж 5 чалавек) | = 50 — " — |
| | 65 чалавек |

| | |
|---|---|
| зменны персанал | 20 чалавек |
| пасыльныя і вадзіцелі | 4 — " — |
| група механікаў | 23 — " — |
| баявы абоз | 28 — " — |
| абоз забеспячэння | 4 — " — |
| | 79 чалавек |

Агульная колькасць:

| | Баявая частка | Іншыя | Усяго |
|---|---|---|---|
| Штабная рота | 75 | 107 | 182 |
| "Лёгкая" танкавая рота | 100 | 82 | 182 |
| "Сярэдняя" танкавая рота | 65 | 79 | 144 |

*(Подпіс)*

[1] Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941—1945: Энцыклапедыя. Мн., 1990. С. 315.

[2] BA-MA — RH 21-2/927: KTB (Kriegstagebuch) № 1 der 2 Panzer-Armee (Panzergruppe 2): Darstellung der Ereignisse am 12. Juli 1941. Bl. 204.

[3] BA-MA. — RH 21-2/124: KTB (Kriegstagebuch) № 1 der 2. Panzer-Armee (Panzergruppe 2): Anlagen v. 12.7.1941. Bl. 3

[4] Ibidem. Bl. 59.

[5] BA-MA — RH 27-3/165: Taetigkeitsbericht der 3. Panzer-Division v. 11.7.41

[6] BA-MA. — RH 27-3/29: Panzer-Regiment 6. Erfahrungsbericht: Kampf der II./Pr.Rg 6 bei Mogilew am 12.7.1941. Bl. 40—45, 49—50.

[7] Ibidem. Bl. 40—42.

[8] Ibidem. Bl. 43—44.

[9] Борисенко Н.С. Днепровский рубеж: Трагическое лето 1941-го. Могилев, 2005; Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Магілёва. Мн., 1998; Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Магілёўскага раёна. Мн., 1996; Волчок Г.И. Оборона Могилева летом 1941 года: вопросы историографии // Оборонительные бои на территории Беларуси: Респ. науч.-практ. конф., посвящ. 65-летию обороны г. Могилева от немецко-фашистских захватчиков (29—30 июня 2006 года) / Под ред. Н.М.Пурышевой. Могилев, 2006. С. 8—16.

[10] Борисенко Н.С. Днепровский рубеж: Трагическое лето 1941-го. С. 3, 5

[11] Tessin G. Verbaende und Truppen der deutschen Wehrmacht und Waffen-SS im Zweiten Weltkrieg. Bd. 15. Die Waffengattungen- und Gesamtuebersicht / G. Tessin. Osnabrueck, 1977. S. 221

**Паважаныя чытачы нашага часопіса!**

Паведамляем вам адрасы гандлёвых кропак УП "Мінгарсаюздрук", у якіх будзе рэалізоўвацца "Беларускі гістарычны часопіс" у 2007 г.

**Магазін № 2**, пр. Незалежнасці, 44; **магазін № 3**, пр. Незалежнасці, 74; **магазін № 8**, вул. Сурганава, 40; **магазін № 14**, вул. К.Маркса, 6; **магазін № 18**, пераход ст. метро "Плошча Перамогі"; **магазін № 21**, пераход ст. метро "Пушкінская"; **магазін № 25**, вул. К.Маркса, 21; **кіёск № 1**, пр. Незалежнасці, 38; **кіёск № 10**, вул. К.Маркса, 38; **кіёск № 11**, пр. Незалежнасці, 10; **кіёск № 12**, пр. Незалежнасці, 18; **кіёск № 13**, вул. Леніна, 18; **кіёск № 70**, вул. Маскоўская, 15; **кіёск № 79**, пр. Пераможцаў, 5; **кіёск № 99**, Прывакзальная плошча (каля будынка міжнародных кас); **кіёск № 110**, вул. Пуліхава, 3; **кіёск № 131**, вул. Сурганава, 17; **кіёск № 145**, пр. Машэрава, 2; **кіёск № 150**, пр. Незалежнасці, 52; **кіёск № 263**, у будынку чыгуначнага вакзала.